## Інфармацыя пра аўтара праекта

| | |
|---|---|
| **Прозвішча, імя, імя па бацьку** | **Лапкоўская Алена Мікалаеўна** |
| **Горад, вобласць** | **Гродна, Рэспубліка Беларусь** |
| **Назва ўстановы адукацыі** | **Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы** |
| **Інфармацыя пра праект** | |
| **Назва праекта** | **Проста пра галоўнае!** |
| **Дэвіз, слоган, цытата** | **Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю.**<br>**(Якуб Колас)** |
| **Кроткая анатацыя** | **Мэта праекта** - распрацаваць комплекс заданняў і практыкаванняў для засваення тэарэтычнага матэрыялу тэмы "Галоўныя члены сказа" і скласці зборнік лінгвістычных казак па тэме "Галоўныя члены сказа", падрыхтаваны пры дапамозе сэрвісаў Web 2.0.<br><br>У працэсе работы над праектам студэнтам неабходна будзе на аснове знаёмства з сервісамі Web 2.0 распрацаваць заданні, практыкаванні, напісаць лінгвістычныя казкі, якія будуць выклікаць інтарэс і зацікаўленасць у студэнтаў пры вывучэнні тэарэтычнага матэрыялу, а таксама садзейнічаць трываламу замацаванню тэорыі на практыцы.<br><br>У выніку работы з праектам студэнты павінны будуць **сфарміраваць наступныя кампетэнцыі:**<br>● ***акадэмічныя***: валодаць даследчымі навыкамі; умець працаваць самастойна; быць крэатыўнымі; валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем; мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прылад, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп’ютарам; валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі; умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця;<br>● ***сацыяльна-асобасныя***: валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый; быць здольным да крытыкі і самакрытыкі; умець працаваць у камандзе;<br>● ***прафесійныя:*** ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.<br><br>**Практычны вынік:** комплекс заданняў і практыкаванняў; зборнік лінгвістычных казак.<br><br>**Тэрмін дзеяння праекта:** 7 тыдняў.<br>**Удзельнікі праекта:** студэнты 3 курса спецыяльнасці "Пачатковая адукацыя" |
| **Прадметная галіна** | Беларуская мова |
| **Вучэбная тэма праекта** | Галоўныя члены сказа |
| **Вучэбны змест праекта** | Прэдыкатыўная аснова простага сказа. Суадносіны дзейніка і выказніка ў фармальнай структуры сказа. Структурныя тыпы дзейніка і выказніка і спосабы іх выражэння ў сучаснай беларускай мове. Сувязь выказніка з дзейнікам, яе віды і рэалізацыя ў сказе. Праблема аднародных дзейнікаў і выказнікаў. |
| **Міжпрадметныя сувязі** | Руская мова, англійская мова. |

| | |
|---|---|
| **Узрост удзельнікаў** | 19 - 20 гадоў |
| **Прыблізная працягласць праекта** | 9 тыдняў |
| **Сайт праекта** | Спасылка |
| **Маршрут** | Універсум |
| **Аснова праекта** | |
| **Адукацыйныя стандарты** | Сеткавы праект “Проста пра галоўнае!” можа быць рэалізаваны ў межах Адукацыйнага стандарта “Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-01 02 01 - “Пачатковая адукацыя” і Тыпавая вучэбная праграма па курсе "Беларуская мова" для спецыяльнасці 1-01 02 01 "Пачатковая адукацыя". |
| **Плануемыя вынікі навучання** | **Асобасныя:** гатоўнасць да самаадукацыі, высокі ўзровень самакантролю (самаадзнака ўменняў аналізаваць, інтэрпрэтаваць, абагульняць і рабіць высновы).<br><br>**Метапрадметныя:** здольнасць студэнтаў да ўзаемадзеяння і ўздзеяння адзін на аднаго ў працэсе работы ў СП (самаадзнака супрацоўніцтва ў камандзе); уменне працаваць у камандзе (узаемаадзнака ўменняў каманднай работы).<br><br>**Прадметныя:** умець вылучаць і характарызаваць галоўныя члены сказа (структура, спосабы і сродкі выражэння); вызначаць асаблівасці іх функцыянавання і ўжывання ў параўнанні з рускай мовай (уваходны тэст "Галоўныя члены сказа"; табліца вынікаў). |
| **Пытанні, што накіроўваюць праект** | |
| **Асноватворнае пытанне** | Ці можна проста і цікава вывучаць складаны і сур'ёзны матэрыял? |
| **Праблемныя пытанні вучэбнай тэмы** | Якія праблемы і складанасці ўзнікаюць пры вывучэнні і выкладанні тэмы “Галоўныя члены сказа”? Што нам дапаможа цікава і лёгка засвоіць тэму? Ці ўмеем мы расказваць казкі? |
| **Прыватныя пытанні вучэбнай тэмы** | 1. Структурныя адзінкі простага сказа. Фармальная, сэнсавая і камунікатыўная арганізацыя простага сказа.<br>2. Просты сказ як монапрэдыкатыўная адзінка.<br>3. Дзейнік. Спосабы і сродкі выражэння дзейніка.<br>4. Тыпы дзейнікаў (намінатыўны і інфінітыўны; просты, просты ўскладнены, складаны, састаўны).<br>5. Выказнік. Спосабы і сродкі яго выражэння.<br>6. Тыпы выказнікаў (просты іменны, просты дзеяслоўны, просты дзеяслоўны ўскладнены, састаўны іменны, састаўны дзеяслоўны, складаны дзеяслоўны, складаны змешаны).<br>7. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў сказе.<br>8. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. |
| **План ацэньвання** | |
| • **да праекта** | 1. Дыскусія з выкарыстанне стартавай прэзентацыі.<br>2.Табліца В-Ц-Д (1-2 слупкі).<br>3. Стартавы тэст па тэме «Галоўныя члены сказа»<br>4. Рэгістрацыя ўдзельнікаў праекта.<br>5. Пагадненне арганізатара праекта і каардынатараў каманд.<br>6. Афармленне візітоўкі каманды.<br>7. Размеркаванне ролей у камандзе (слайд 8 стартавай прэзентацыі). |

| | |
|---|---|
| • **падчас праекта** | 1. Бланк самаарганізацыі працы ўнутры каманды<br>2. Бланк ацэньвання сумеснай работы<br>3. Табліца ацэньвання работ членаў каманды.<br>4. Правілы работы ў камандзе<br>5. Табліца перамяшчэння ("Крокі да поспеху")<br>6. Дзённік ўдзельніка сеткавага праекта<br>7. Форум удзельнікаў |
| • **па заканчэнні праекта** | 1. Табліца В-Ц-Д (3 слупок)<br>2. Самаадзнака свайго ўкладу ў работу каманды.<br>3. Бланк узаемаадзнакі ўменняў каманднай работы |
| **Звесткі пра праект** | |
| **Неабходныя пачатковыя веды, уменні, навыкі** | *Ведаць:* структурныя адзінкі простага сказа; спосабы і сродкі выражэння галоўных членаў сказа.<br><br>*Умець характарызаваць:* галоўныя члены сказа і вызначаць асаблівасці іх функцыянавання і ўжывання ў параўнанні з рускай (англійскай) мовай.<br><br>*Валодаць навыкамі:* вылучэння са сказа дзейніка і выказніка; поўнага сінтаксічнага разбору простага сказа; валодання вуснай і пісьмовай формамі літаратурнай мовы; карыстацца моўнымі сродкамі беларускай мовы ў практычнай дзейнасці, а таксама выбіраць і абгрунтоўваць тэму праекта; падбіраць неабходную інфармацыю для рэалізацыі праекта; прапрацоўваць структуру сумеснай дзейнасці ўдзельнікаў; афармляць вынікі праектнай дзейнасці. |
| **План правядзення праекта** | **Падрыхтоўчы этап** (першы тыдзень праекта).<br>- знаёмства з буклетам праекта;.<br>- дыскусія па старатавай прэзентацыі;<br>- знаёмства з планам і правіламі работы, тэрмінам выканання, крытэрыямі ацэньвання заданняў;<br>- вывучэнне зместу тыпавой праграмы, патрабаванняў адукацыйнага стандарта спецыяльнасці “Пачатковая адукацыя”;<br>- выкананне тэста па тэме “Галоўныя члены сказа”;<br>- падзел на каманды, размеркавання ролей;<br>- рэгістрацыя каманд.<br>**Асноўны этап** (пяць тыдняў)<br>**Этап 1. “Людзей слухай, а свой розум май”.**<br>- праводзім мазгавы штурм;<br>- даследуем науковую и навукова-метадычную літаратуру па тэме праекта;<br>- распрацоўваем анкету для настаўнікаў і выкладчыкаў ВНУ з мэтай высвятлення цяжкіх і праблемных пытанняў па тэме праекта;<br>- праводзім анкетаванне настаўнікаў і выкладчыкаў ВНУ; апрацоўваем і аналізуем анкеты;<br>- арганізуем onlain-канферэнцыю для абмеркавання атрыманых вынікаў і вызначэння праблемных і цяжкіх для засваення пытанняў тэмы "Галоўныя члены сказа";<br>- запаўняем табліцы перамяшчэння каманды, асабістага ўдзелу, самаадзнакі.<br>**Этап 2. “Разумная дачка”.**<br>- праводзім мазгавы штурм;<br>- пішам эсэ "Што я ведаю пра лінгвістычную казку?";<br>- складаем дыдактычны матэрыял у выглядзе ментальных карт, пазлаў, крыжаванак і г.д., якія дапамогуць засвоіць тэарэтычны матэрыял тэмы "Галоўныя члены сказа";<br>- складаем разгорнутыя канспекты па вывучэнні галоўных членаў сказа ў пачатковых класах, сярэдняй школе і ВНУ; |

| | |
|---|---|
| | - праводзім апрабаванне матэрыялу;<br>- запаўняем табліцы перамяшчння каманды, асабістага ўдзелу, самаадзнакі.<br>**Этап 3. “1000 і адна казка”**.<br>- кожная каманда піша лінгвістычныя казкі па пытаннях тэмы "Галоўныя члены сказа";<br>- афармляем казакі пры дапамозе сервісаў Web 2.0;<br>- запаўняем табліцы перамяшчэння каманды, асабістага ўдзелу, самаадзнакі.<br>**Заключны этап** (адзін тыдзень)<br>- здача работ на экспертызу;<br>- правядзенне экспертызы падрыхтаваных работ;<br>- прэзентацыя падрыхтаваных работ;<br>- узаемаадзнака прадуктаў праекта;<br>- запаўненне табліцы перамяшчэння;<br>- падвядзенне вынікаў;<br>- рэфлексія па выніках праекта.<br><br>Больш падрабязна план адлюстраваны на старонцы План праекта |
| **Прадукты праектнай дзейнасці студэнтаў** | Дыдактычны матэрыял для зборніка практыкаванняў па тэме “Галоўныя члены сказа” (пазлы, крыжаванкі, інтэрактыўныя плакаты, відэа). Зборнік лінгвістычных казак па тэме "Галоўныя члены сказа", эсе “Што я ведаю пра лінгвістычную казку?”, канспекты для вывучэнні галоўных членаў сказа ў пачатковых класах (прэзентацыя), сярэдняй школе і ВНУ. |
| **Форма правядзення** | Камандная (падзел на тры каманды). |
| **Правілы для ўдзельнікаў** | Правілы работы ў камандзе |
| **Матэрыялы для дыферэнцыйнага навучання** | |
| **Студэнт з праблемамі засваення вучэбнага матэрыялу** | Сеткавы праект прадугледжвае работу ў камандзе. Ролі ў камандзе будуць размеркаваны такім чынам, каб студэнты з праблемамі засваення вучэбнага матэрыялу, маглі працаваць на роўных і выконваць пасільныя ім заданні. З дапамогай распрацаваных выкладчыкам алгарытмаў работы на кожным этапе праекта, наяўнасці ўзораў тых ці іншых работ такія студэнты змогуць працаваць у праекце і падымаць сваю самаадзнаку. |
| **Студэнт, для якога мова выкладання не родная** | Ва ўніверсітэце, безумоўна, вучацца студэнты розных нацыянальнасцей, але паколькі беларуская мова з'яўляецца дзяржаўнай, то яе вывучэнне з'яўляецца абавязковым для ўсіх удзельнікаў вучэбнага працэсу. |
| **Адораны студэнт** | Пры рабоце ў камандзе для адоранага студэнта будуць прадугледжаны дадатковыя заданні, якія будуць насіць творчы і эўрыстычны характар. |
| **Матэрыялы, неабходныя для правядзення праекта** | |
| **Абсталяванне** | Планшет, ноутбук або камп’ютар. |
| **Праграмнае забеспячэнне** | Аперацыйная сістэма Windows 10, праграмы для: кіравання файламі, апрацоўкі тэкстаў, стварэння прэзентацый; кліенцкія праграмы электроннай пошты (e-mail); магчымасць выхаду ў Інтэрнэт. |

| | |
|---|---|
| **Матэрыялы на друкаванай аснове** | Падручнікі і дапаможнікі, якія ўказаны ў Маёй стартавай прэзентацыі. |
| **Іншыя прыналежнасці, калі неабходна** | Неабходнасць у іншых прыналежнасцях можа ўзнікнуць у працэсе работы над праектам. На дадзеным этапе мы не можам гэтага прадугледзець. |
| **Інфармацыйныя крыніцы ў Інтэрнэце** | Паколькі мы толькі распрацоўваем праект, то плануем, што спасылкі на інфармацыйныя крыніцы, будуць з'яўляцца падчас напісання праекта. |
| **Web-сервісы** | Больш падрабязна пра сервісы Web 2.0, што будуць выкарыстоўвацца ў праекце гл. на старонцы Сервісы Web 2.0 |
| **Арганізацыя ўзаемадзеяння з каардынатарамі каманд** | Узаемадзеянне з каардынатарамі каманд плануецца быць штотыднёвым. Кантроль будзе весці не толькі педагог (я), але і камандзіры каманд. |
| **Заўвагі аўтараў праекта** | |